# 25 год Ленінска-Сталінскага комсамола Беларусі

**М. ЗІМЯНІН**

24 верасня споўнілася 25 год з дня склікання І З'езда Ленінскага комсамола Беларусі.

Скліканню І З'езда комсамола рэспублікі прадшэствавала шматгадовая плённая работа большэвікоў Беларусі па згуртаванню і выхаванню працоўнай моладзі ў духу ленінізма, па ўцягненню яе ў актыўную рэволюцыйную барацьбу, па стварэнню і ўмацаванню комсамольскіх арганізацый Беларусі ў годы грамадзянскай вайны і барацьбы супроць нямецкіх і белапольскіх захопнікаў.

Пролетарскія маладзёжныя арганізацыі Беларусі, як і ўсёй нашай вялікай Радзімы, прайшлі вялікі шлях, пачаткам якога з'явіліся с. д. гурткі рабочай моладзі, ствараемыя большэвіцкімі камітэтамі ў 1904—1905 гг. і прымаўшыя ўдзел у стачках і барыкадных баях першай рускай рэволюцыі. У перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 года «Саюзы соцыялістычнай рабочай моладзі» актыўна дапамагалі большэвіцкай партыі ў падрыхтоўцы і ажыццяўленні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Пасля створаныя комуністычныя саюзы рабочай і сялянскай моладзі аб'ядналіся на сваім першым З'ездзе ў кастрычніку 1918 г. у адзіны Расійскі Комуністычны Саюз Моладзі.

Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, вызваліўшая нашу моладзь ад памешчыцка-капіталістычнага гнёту і адкрыўшая перад ёю бязмежныя перспектывы свабоднай працы, адукацыі, павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню, актыўнага ўдзелу ў дзяржаўным будаўніцтве совецкай Радзімы,—акрыліла маладое пакаленне працоўных. Яго адданасць партыі Леніна—Сталіна знайшла яркае выражэнне ў той беззаветнай мужнасці, з якой змагаліся маладыя байцы Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны, у хуткім масавым разгортванні комуністычных саюзаў моладзі, стаўшых бліжэйшымі памочнікамі партыйных арганізацый, невычарпальным баявым рэзервам партыі.

Моладзі Беларусі, як і ўсяму беларускаму народу, прышлося прайсці суровыя выпрабаванні ў жорсткай барацьбе з нямецкімі і белапольскімі захопнікамі, адстойваць родную совецкую ўладу са зброяй у руках у радах Чырвонай Арміі, партызанскіх атрадах і ў большэвіцкім падполлі. Моладзь упісала слаўныя старонкі ў гісторыю гэтай барацьбы. І стварэнне першых комуністычных саюзаў моладзі ў Беларусі адносіцца іменна да таго часу, калі Чырвоная Армія, падтрыманая ўсім совецкім народам, працоўнымі Беларусі і Украіны, разгарнуўшымі жорсткую барацьбу ў тылу ворага,—граміла нямецкія полчышчы, вызваляючы ад іх зямлю Совецкай Беларусі і Украіны. Першымі арганізацыямі комсамола ў Беларусі былі Віцебская, Аршанская (кастрычнік 1918 г.), Мінская, Бабруйская.

Адбыўшыйся ў кастрычніку 1918 г. І З'езд РКСМ, які аб'яднаў мясцовыя комуністычныя арганізацыі моладзі ў адзіны саюз, адыграў велізарную ролю і ў справе стварэння і росту комсамольскіх арганізацый на Беларусі. У снежні 1918 года былі створаны гарадскія аргані-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

зацыі комуністычнага саюза моладзі ў Мінску, Магілеве, Бабруйску, а затым і ў іншых гарадах і сёлах Беларусі.

У перыяд белапольскай акупацыі комсамольскія арганізацыі Беларусі, асабліва Мінская, Бабруйская, Баранавіцкая, Слуцкая, вялі пад кіраўніцтвам КП(б) Беларусі вялікую палітычную і арганізацыйную работу па мабілізацыі сіл моладзі на разгром акупантаў, па ўцягненню маладых рабочых і сялян у партызанскі рух. Спробы акупантаў знішчыць падпольныя комсамольскія арганізацыі не мелі поспеху нават там, дзе ворагу з дапамогаю буржуазна-нацыяналістычных шпіёнаў і правакатараў удавалася захапіць асобных падпольшчыкаў, як гэта было ў Мінску, Бабруйску, Слуцку. Ні катаванні, ні пагрозы, ні смерць не маглі пахіснуць стойкасці маладых большэвікоў, прымусіць іх выдаць арганізацыю.

Моладзь самаахвярна змагалася ў партызанскіх атрадах, якія пад кіраўніцтвам КП(б) Беларусі выраслі ў вялікую ваенную сілу і наносілі ўдары па камунікацыях і жывой сіле ворага. Маладыя партызаны Дукорскай воласці, якімі камандаваў матрос Андрэй Блажко,—іх было звыш 100 чалавек,—адзначаліся асаблівай актыўнасцю ў знішчэнні белапалякаў і падрыве іх камунікацый. Атрад Блажко вёў вялікую палітычную работу сярод сялян, рыхтуючы іх да ўзброенага паўстання. Карныя атрады ворага акружылі раён дыслакацыі партызан, арыштавалі і падверглі катаванням сотні сялян і захопленых у баях раненых партызан. Два тыдні цягнулася расправа, але партызан ніхто не выдаваў. Тады ваенна-палявы суд прыгаварыў к расстрэлу 11 захопленых партызан. Праз дзве гадзіны Андрэй Блажко, Сцяпан Камлюк, Андрэй Крывашчок, Міхаіл Рудовіч, Максім Маліноўскі, Павел Пазняк, Ілья Камлюк, Пётр Буры, Іван Камлюк, Андрэй Ахрамовіч, Грыгорый Катлянік былі расстраляны. Яны не выдалі нікога з таварышоў, іх імёны навекі засталіся ў памяці народа.

Летам 1920 г., пасля разгрому белапольскіх акупантаў, арганізаванага тварцом беларускай совецкай дзяржавы таварышам Сталіным, вышлі з падполля і разгарнулі актыўную масавую работу сярод моладзі комсамольскія арганізацыі Мінска, Бабруйска, Слуцка, Барысава Чэрвеня і іншых гарадоў і сёл Беларусі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

24 верасня 1920 г. у гор. Мінску адкрыўся І З'езд комсамола Беларусі, на якім прысутнічала 140 дэлегатаў, прадстаўляўшых 3.000 членаў комсамола. З'езд намеціў важнейшыя мерапрыемствы, накіраваныя на ўзмацненне палітычнай работы комсамольскіх арганізацый сярод моладзі, на дапамогу большэвіцкай партыі ў абароне краіны, і выбраў дэлегатаў на III З'езд РКСМ. На з'ездзе быў выбран і ЦК КСМ Беларусі.

Так закончыўся перыяд фарміравання комсамола Беларусі, створанага комуністычнай партыяй большэвікоў у агні грамадзянскай вайны і барацьбы совецкага народа супроць чужаземных захопнікаў.

Выдатнай гістарычнай датай у жыцці комсамола і ўсёй совецкай моладзі з'яўляецца 2 кастрычніка 1920 года. У гэты дзень з прамовай—«Задачы саюзаў моладзі» выступіў на III З'ездзе РКСМ Владзімір Ільіч Ленін.

З непераўзыйдзенай глыбінёй і яснасцю вызначыў Владзімір Ільіч кардынальныя задачы комсамола ў святле геніяльнай тэорыі аб пабудове комунізма ў нашай краіне. Ленінскі наказ захоўвае найвялікшую жыццёвую сілу для цэлых пакаленняў совецкай моладзі. «Моладзі прадстаіць сапраўдная задача стварэння комуністычнага грамадства»,—заявіў Владзімір Ільіч. Але для гэтага яна павінна

вучыцца комунізму, а вучыцца комунізму—значыць узбагаціць «памяць веданнем усіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва», авалодаць навукай марксізма.

Гэты мудры ленінскі наказ з'яўляецца непахіснай асновай усёй палітыка-выхаваўчай, дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці комсамола, як баявога памочніка большэвіцкай партыі.

Выконваючы ўказанні Леніна, комсамол Беларусі з першых-жа дзён мірнага будаўніцтва паднімаў моладзь на дапамогу партыі і народу ў аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі, арганізоўваў марксісцка-ленінскую, агульна-адукацыйную і вытворча-тэхнічную вучобу моладзі, уцягваў яе ў прафтэхшколы, школы ФЗА, клапаціўся аб палепшанні ўмоў яе працы і быту. Комсамол няўхільна пашыраў свой уплыў на масы сельскай моладзі, прыцягваючы яе да актыўнага ўдзелу ў палітычных і гаспадарчых мерапрыемствах на сяле, адстайваючы інтарэсы батрацтва і беднаты, разгарнуўшы славуты паход за ліквідацыю непісьменнасці.

Лепшыя комсамольцы накіроўваліся на работу ў органы савецкай улады. К пачатку 1926 г. 32% старшынь і сакратароў сельсаветаў рэспублікі з'яўляліся комсамольцамі.

У 1923—24 гг. рэзка ўзмацнілася ўвага комсамола да школы, і ў Беларусі пачаў разгортвацца масавы дзіцячы комуністычны рух.

21 студзеня 1924 г. памёр В. І. Ленін. У цвёрдай рашымасці ісці па шляху, указанаму бяссмертным правадыром, працоўныя СССР яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол большэвіцкай партыі і вялікага прадаўжальніка справы Леніна — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Партыя аб'явіла ленінскі прызыў у свае рады. Па прыкладу сваіх бацькоў і старэйшых братоў, уступаўшых у рады партыі большэвікоў, працоўная моладзь уступала ў комсамол. На працягу аднаго паўгоддзя рады комсамола Беларусі падвоіліся.

VII З'езд комсамола Беларусі, які адбыўся ў чэрвені 1924 года, аднагалосна рашыў прыняць найменне Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі, становячыся пад вялікае імя Леніна для таго, каб у вучэнні, працы і баі быць верным заветам В. І. Леніна.

Дзейнасць комсамола, накіроўваемая клопатамі партыі Леніна — Сталіна аб няўхільным павышэнні матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню моладзі, аб развіцці яе комуністычнай свядомасці і грамадскай актыўнасці, набывала ўсё больш шырокі размах. Прымаючы непасрэдны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, комсамол ставіў задачу глыбокага вывучэння масамі комсамольцаў і моладзі гісторыі большэвіцкай партыі, асноў марксізма-ленінізма, непрымірымай барацьбы супроць усіх спроб трацкістаў — злейшых ворагаў партыі і народа,—адарваць комсамол ад партыі, проціпаставіць яго партыйнаму кіраўніцтву.

Пад кіраўніцтвам нашай партыі комсамол Беларусі бязлітасна граміў трацкісцкіх здраднікаў, дапамагаў у выкрыцці і выкарчоўванні буржуазна-нацыяналістычных мярзотнікаў, прабаваўшых адарваць Беларусь ад вялікай савецкай Радзімы.

Свята аберагаючы класавую чыстату сваіх радоў, даючы сакрушальны адпор усім намаганням ворагаў савецкага ладу ўкараніць антынародныя, буржуазна-нацыяналістычныя погляды ў асяроддзі беларускай моладзі, — комсамол Беларусі рос і мужнеў, няўхільна пашыраючы свой ідэйны ўплыў на маладое пакаленне краіны, згуртоўваючы яго вакол партыі Леніна — Сталіна.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У гістарычныя годы соцыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у час сталінскіх пяцігодак комсамол заўсёды выступаў актыўным, самаадданым памочнікам партыі большэвікоў ва ўсіх галінах дзяржаўнага і гаспадарчага будаўніцтва, быў сапраўдным рычагом у ажыццяўленні ідэйнага і арганізацыйнага ўплыву партыі на мільённыя масы совецкай моладзі.

У будаўніцтве сталінскіх пяцігодак,ператварыўшых Совецкую Беларусь, як і ўсю нашу совецкую Радзіму, у краіну перадавой соцыялістычнай індустрыі, комсамольцы і моладзь рэспублікі паказалі ўзоры масавага працоўнага гераізма. Тысячы комсамольцаў і моладзі былі накіраваны комсамолам на будаўніцтва такіх важных прадпрыемстваў, як Белгрэс імені Сталіна, Гомсельмаш, фабрыкі «КІМ» і «Сцяг індустрыялізацыі», шклозавод імені Сталіна, Магілеўская шоўкавая фабрыка і інш. Моладзь Беларусі праявіла высокую ступень палітычнай спеласці, сапраўды большэвіцкае пачуццё новага, з велізарным энтузіязмам падхапіўшы пачын Масквы і Ленінграда ў разгортванні масавага соцыялістычнага спаборніцтва. Рух ударнікаў набыў сярод моладзі велізарны размах.

Новы, вышэйшы этап соцыялістычнага спаборніцтва, — стаханаўскі рух пачаў бурна развівацца ў Беларусі, і моладзь хутка вылучыла са свайго асяроддзя тысячы выдатных наватараў соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, такія, напрыклад, як узнагароджаная ордэнам Леніна работніца фабрыкі «КІМ» Падскочая, токар, цяпер намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, Майораў і інш. 69 маладых стаханаўцаў Беларускай ССР за выдатныя дасягненні ў працы былі ўзнагароджаны ордэнамі Саюза ССР. Аб незвычайным павышэнні культурна-тэхнічнага ўзроўню маладых кадраў рабочага класа Беларусі сведчыць той факт, што ў 1939—1940 гг. комсамольцы і моладзь 26 прадпрыемстваў рэспублікі ўнеслі 688 рацыяналізатарскіх прапаноў, рэалізацыя якіх дала больш паўтара мільёна рублёў эканоміі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Комсамол Беларусі актыўна дапамагаў партыі ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Комсамольцы першымі ўступалі ў калгасы, вялі сярод сялян прапаганду за іх, выкрывалі антыкалгасныя махінацыі кулацтва.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі